УДК 94(476)“1861/1914”

***А.Г. Каханоўскі***
*д-р гіст. навук, дац., заг. каф. гісторыі Беларусі новага і навейшага часу*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

# ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ Ў САСЛОЎНА-КАРПАРАТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*У артыкуле дадзены аналіз прычын стварэння саслоўя ганаровых грамадзян, паказаны межы і сацыяльная база папаўнення яго шэрагаў, магчымасці атрымання дадзенага саслоўнага звання, выкарыстання яго ў якасці канала для рэлізацыі магчымасцей узыходзячай сацыяльнай мабільнасці. Асобна ахарактарызаваны саслоўна-прававое становішча, сацыяльны і нацыянальны склад ганаровых грамадзян Беларусі, які, паводле высноў аўтара, вызначаўся пераважна кірункам палітыкі ўраду Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі.*

**Уводзіны**

Саслоўнае грамадства ўяўляе сабой дастаткова кансерватыўную сістэму, якая на працягу дзесяцігоддзяў вонкава выглядала стабільнай, з мала заўважнымі зменамі. Развіццё эканомікі, сацыяльна-культурныя працэсы знаходзілі ў саслоўнай структуры насельніцтва апасродкаваны, запознены адбітак. Аднак гэта толькі вонкава. Працэсы мабільнасці насельніцтва, і сацыяльнай, і тэрытарыяльнай, якія вызначалі змены, былі ўласцівы і саслоўнаму грамадству Беларусі, асабліва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Імкненне да сацыяльнага поспеху стала рысай, якая вызначала жыццёвыя абставіны для ўсё больш шырокага кола прадстаўнікоў розных саслоўных груп. Найбольш папулярным і рэальным каналам сацыяльнага поспеху ва ўмовах XIX – пачатку XX ст. стала атрыманне адукацыі, што давала магчымасць паступіць на дзяржаўную службу. У выніку пашырэння сферы выяўлення сацыяльнай актыўнасці насельніцтва выраслі магчымасці для сацыяльнага ўздыму. У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. паступова больш даступнымі сталі межы саслоўяў для прадстаўнікоў іншых груп, пашырыўся пералік заканадаўча акрэсленых даступных заняткаў для кожнага з саслоўяў. Расійскае заканадаўства зрабіла больш даступнымі саслоўныя межы мяшчанства, сялянства, фармалізавала прыналежнасць да купецтва, праз царкоўныя рэформы адмяніла замкнёнасць як саслоўя хрысціянскага духавенства, але ў той жа час значна павысіла патрабаванні для атрымання дваранскай годнасці за заслугі на грамадзянскай і вайсковай службе. Асабліва быў ускладнены шлях выслугі спадчыннага дваранства. Эвалюцыя прававога становішча расійскага дваранства адбывалася не праз адмену яго прывілеяў, а ў сувязі з пашырэннем праў іншых саслоўяў [1, с. 14]. Найбольш адкрытымі для трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве аказаліся гарадскія саслоўі, ці гарадскія абывацелі, якія найбольш дынамічна адлюстроўвалі сацыяльныя змены, сталі іх носьбітамі. Пад гарадскімі абывацелямі меліся на ўвазе асобы, якія прылічаліся законам да «сярэдняга роду людзей». Сярод іх вылучаліся чатыры розныя групы: ганаровыя грамадзяне, купцы, мяшчане і цэхавыя. Адначасова законамі аб станах Расійскай імперыі да гарадскіх абывацеляў былі аднесены ўсе тыя, хто быў гарадскім старажылам ці там нарадзіўся, пасяліўся, а таксама тыя, хто меў у горадзе нерухомую маёмасць, быў запісаны ў гільдыю ці рамесніцкі цэх, меў «службу гарадскую», быў прыпісаны да мяшчан [2, с. 59]. Гарадскія саслоўі не ўяўлялі сабой кансалідаваных карпаратыўных груп насельніцтва, больш таго многія з іх прадстаўнікоў пражывалі стала ў сельскай мясцовасці і мелі ўскоснае дачыненне да гарадскога жыцця.

Мэта артыкула – паказаць саслоўна-прававое становішча ганаровых грамадзян Беларусі, іх месца ў саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі грамадства, выявіць дынаміку іх колькаснага складу. Аналіз гістарыяграфіі дазваляе сцвярджаць, што ганаровыя грамадзяне як саслоўная група насельніцтва Беларусі яшчэ не стала прадметам самастой-

нага разгляду, знайшла ўрыўкавае, часта ўскоснае адлюстраванне ў даследчыцкай літаратуры па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі сярэдзіны XIX – пачатку XX ст.

**Саслоўе ганаровых грамадзян і яго прававая арганізацыя**

Саслоўе ганаровых грамадзян было створана ў 1832 г. з мэтай абмежавання імкнення адукаваных людзей да атрымання дваранскай годнасці [3, с. 193–195]. Яго прадстаўнікі былі вызвалены ад цялеснага пакарання, рэкруцкай павіннасці, падушнага падатку, дысцыплінарнай улады саслоўных аб'яднанняў падатковага насельніцтва. Званне ганаровага грамадзяніна магло быць пажыццёвым (асабістым) або перадавацца ў спадчыну. Спадчынныя і асабістыя ганаровыя грамадзяне, у адрозненне ад вышэйшага саслоўя, мелі аднолькавыя правы [4, с. 305]. Спадчыннае ганаровае грамадзянства, у адрозненне ад асабістага, маглі атрымаць толькі расійскія грамадзяне. Ад нараджэння да спадчынных ганаровых грамадзян прылічаліся дзеці асабістых дваран, чыноўнікаў і афіцэраў, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі Св. Ганны, Св. Станіслава, ці дасягнуўшых на грамадзянскай службе чыну IX класа, а таксама дзеці праваслаўных і армяна-грыгарыянскіх святароў, праваслаўных псаломшчыкаў, якія закончылі акадэмію ці семінарыю, пратэстанцкіх прапаведнікаў і г.д. [2, с. 60–61]. Асабістае ганаровае грамадзянства маглі атрымаць тыя, хто на дзяржаўнай службе дасягнуў XIV класнага чыну [2, с. 62]. Асабістае ганаровае грамадзянства атрымлівалі таксама асобы, якіх усынавілі дваране ці спадчынныя грамадзяне, удовы праваслаўных псаломшчыкаў і інш. [2, с. 61]. Гэта званне магло быць нададзена за «карысную дзейнасць» у розных сферах на працягу не менш 10 гадоў. На званне спадчыннага ганаровага грамадзяніна маглі прэтэндаваць асобы пасля 10 гадоў знаходжання ў статусе асабістага ганаровага грамадзяніна ці без гэтага пасля 20 гадоў «карыснай дзейнасці», пацверджанай дзяржаўным ведамствам [5, с. 833]. За выдатныя поспехі ў навуцы, мастацтве, гандлёва-прамысловай дзейнасці указам імператара маглі атрымаць ганаровае грамадзянства яўрэі рысы аседласці. Падставай для такога рашэння магла быць праца ў якасці наглядчыка яўрэйскіх вучылішчаў, утрыманне падобных вучылішчаў, пастаянная дзейнасць па выкананню асобых даручэнняў губернатара, якія патрабавалі ведання яўрэйскіх традыцый і звычаяў, але толькі пасля пятнадцацігадовай выслугі. Правы ганаровых грамадзян маглі набываць асобы, якія не мелі правоў вышэйшага стану [2, с. 60].

Купцы маглі стаць спадчыннымі ганаровымі грамадзянамі ў выпадку, калі мелі званне камерц- ці мануфактур-саветніка, былі ўзнагароджаны ордэнам ці знаходзіліся 10 гадоў у складзе першай гільдыі, або 20 гадоў у другой гільдыі. Пазней на прылічэнне да спадчыннага ганаровага грамадзянства маглі прэтэндаваць толькі купцы першай гільдыі пасля 20 гадоў знаходжання ў названым разрадзе [2, с. 61–62]. Прыналежнасць да ганаровага грамадзянства перадавалася ад мужа жонцы, за выключэннем выпадку, калі яна належала да вышэйшага саслоўя. Ганаровае грамадзянства маглі атрымаць купцы заходніх губерняў незалежна ад гільдыі, але ў выпадку, калі набывалі маёнткі коштам не менш 15 000 руб. без дапамогі пазыкі, ці з прыцягненнем пазыкі, але коштам не менш 30 000 руб. [2, с. 62].

У беларускіх губернях вышэйшага гарадскога саслоўя часам удастойваліся асобы за ўмацаванне тут рускіх пачаткаў. Указам імператара ад 21 студзеня 1874 г. пецярбургскаму купцу другой гільдыі А. Верамецка разам з сынам быў нададзены статус спадчыннага ганаровага грамадзяніна ў сувязі з набыццём у Мінскай губерні маёнтка Караліна, які раней належаў памешчыку польскага паходжання Палонскаму [6, арк. 6].

Асабістае ганаровае грамадзянства магла атрымаць асоба, якая паспяхова скончыла расійскі ўніверсітэт або атрымала атэстат аб сканчэнні поўнага курса навучання ў Акадэміі мастацтваў, а таксама тыя, хто належаў да гандлёвай буржуазіі ці быў уладальнікам значных прамысловых прадпрыемстваў. Спадчыннымі маглі стаць тыя асабістыя ганаровыя грамадзяне, якія мелі значныя поспехі ў навуках і мастацтве: атрыман-

не вучонай ступені доктара і магістра, 10 гадоў пленнай дзейнасці ў мастацкай сферы. Асобым прадстаўленнем маглі быць прылічаны да ганаровых грамадзян таксама выпускнікі тэхнічных вучылішчаў і настаўніцкіх семінарый. Законам ад 2 ліпеня 1892 г. было дазволена прылічаць да асабістых ганаровых грамадзян любога грамадзяніна, які на працягу 10 год займаўся карыснай грамадскай дзейнасцю. Да спадчынных адносілі тых асабістых грамадзян, якія займаліся той жа дзейнасцю.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. пашырэнне саслоўных меж ганаровых грамадзян адбывалася пад уплывам развіцця сістэмы адукацыі, павелічэння магчымасцей атрымання дзяржаўнай службы для асоб недваранскага паходжання. Фарміраванне саслоўя ганаровых грамадзян спалучала дзве тэндэнцыі. З аднаго боку, захоўвалася сістэма набыцця праў саслоўнай прыналежнасці праз перадачу ў спадчыну ці па нараджэнні. З другога – спроба ўключэння ў дадзеную сацыяльную групу асоб, якія мелі значныя асабістыя заслугі перад дзяржавай і грамадствам не толькі на дзяржаўнай службе, але і ў сферы прадпрымальніцтва, сельскай гаспадаркі, навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці. Ганаровыя грамадзяне, у адрозненне ад іншых саслоўяў, па прычыне дастаткова шырокай сацыяльнай базы фарміравання не вылучаліся ўнутраным адзінствам. У іх лік уваходзілі людзі, якія мелі рознае сацыяльнае паходжанне, сферу дзейнасці, узровень даходаў. У асяроддзі ганаровых грамадзян існавалі сацыяльныя катэгорыі, якія захоўвалі свае ранейшыя саслоўныя правы: купцы – адпаведнае званне і адрозненні, сыны асабістых дваран – магчымасць бесперашкодна паступаць на дзяржаўную службу нароўні з прадстаўнікамі вышэйшага саслоўя. Ганаровы грамадзянін па законе адносіўся да ліку гарадскіх саслоўяў, аднак не меў ніякай сувязі з гарадскім таварыствам. Напрыклад, дачка сельскага дзячка карысталася правамі асабістага ганаровага грамадзянства. Тыя ж правы мог атрымаць селянін, які скончыў земляробчае вучылішча і меў трохгадовую практыку заняткаў сельскай гаспадаркай [4, с. 303].

Ганаровыя грамадзяне не мелі ўласнай карпаратыўнай арганізацыі, былі вольныя ад прыпіскі да якога-небудзь горада [1, с. 78]. Згодна палажэння ад 3 чэрвеня 1894 г., яны павінны былі атрымліваць у паліцэйскіх установах бестэрміновыя пашпартныя кніжкі, што давала ім магчымасць тэрытарыяльнай мабільнасці. У ганаровых грамадзян як саслоўнай групы прысутнічалі рысы, якія набліжалі іх да дваранства: падзел на асабістую і спадчынную часткі, разгляд спраў аб наданні ганаровага грамадзянства ў Дэпартаменце герольдыі Сената [1, с. 79–80]. Аднак гэтыя рысы насілі фармальны характар. Хадайніцтвы аб прылічэнні да ганаровых грамадзян падаваліся ў Дэпартамент герольдыі Сената. Да іх прыкладаліся дакументы, якія пацвярджалі права на прыналежнасць да ганаровага грамадзянства, а таксама пасведчанні, выдадзеныя губернатарамі, аб канфесійнай прыналежнасці кандыдатаў [2, с. 63]. Прэтэндэнты павінны былі, акрамя таго, уплаціць пошліну. Станоўчыя рашэнні Сената зацвярджаліся імператарам, а асобам, узведзеным у спадчыннае ганаровае грамадзянства, выдаваліся спецыяльнага ўзору граматы, у асабістае – пасведчанні [2, с. 64]. Асобы, якія належалі да ганаровага грамадзянства па праву нараджэння, былі пазбаўлены неабходнасці зацвярджэння сваёй саслоўнай прыналежнасці ў Сенаце. Дзеці асабістых ганаровых грамадзян прылічаліся да мяшчанскай грамады па месцы жыхарства [2, с. 65]. Сучаснікі называлі ганаровых грамадзян ядром сярэдняга класа, які складваўся ў той час. Гэта група дынамічна расла, і перш за ўсё за кошт пашырэння кола асоб, якіх адносілі да ліку ганаровых грамадзян.

## Дынаміка колькасці і нацыянальны склад ганаровых грамадзян

У беларускіх губернях у 1863 г. налічвалася 784 спадчынныя ганаровыя грамадзяніны, 780 – асабістых ганаровых грамадзян [7, с. 46–47]. Яны разам складалі 0,03% ад агульнай колькасці насельніцтва беларускіх губерняў. Паводле даных перапісу 1897 г., сярод насельніцтва беларускіх губерняў налічвалася ўжо 13 980 ганаровых грамадзян, з іх 6 235 чалавек (44,6%) пражывалі ў гарадах, 7 745 чалавек (55,4%) у сельскай мяс-

цовасці [8, с. 162–163; 9, с. 48–49; 10, с. 56–57; 11, с. 50–51; 12, с. 50–51]. Ганаровыя грамадзяне складалі 0,3% насельніцтва беларускіх губерняў, у тым ліку 0,6% ад агульнай колькасці жыхароў гарадоў і 0,2% – сельскага насельніцтва. У 35 паветах Беларусі было 10 889 (0,2%) ганаровых грамадзян. Па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі ўдзельная вага ганаровых грамадзян складала 0,3% [13, с. 164–167].

Сярод ганаровых грамадзян беларускіх губерняў, адпаведна даным перапісу насельніцтва 1897 г., налічвалася 4 661 чалавек (33,3%), якія прызнавалі ў якасці роднай мовы беларускую, 6 894 (49,3%) – рускую, 399 (2,9%) – польскую, 1 142 (8,2%) – яўрэйскую [8, с. 162; 14, с. 254; 10, с. 288; 11, с. 222; 12, с. 250]. Ганаровыя грамадзяне складалі 0,09% ад агульнай колькасці беларусаў, якія пражывалі на тэрыторыі беларускіх губерняў, 1,4% – сярод рускіх, 0,09% – палякаў, 0,09% – яўрэяў [8, с. 162; 14, с. 254; 10, с. 288; 11, с. 222; 12, с. 250]. Па сваім нацыянальным складзе ганаровыя грамадзяне, як і асабістыя дваране, адлюстроўвалі прыярытэты ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, кірунак рэгулюемых мясцовай адміністрацыяй змен у сацыяльнай і этнічнай структурах насельніцтва, перш за ўсё мерапрыемствы па ўмацаванні «рускіх пачаткаў у краі», уведзеныя абмежаванні ў эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах у дачыненні да католікаў і яўрэяў. Адчувальным быў і суб’ектыўны фактар, звязаны з сацыяльнымі паводзінамі асобных з прадстаўнікоў карэннага насельніцтва, якія пры ўмове дасягнення сацыяльнага поспеху імкнуліся пазбавіцца ад уласнай беларускамоўнай, «вясковай», ніжэйшай па іх разуменні, культурнай традыцыі, далучыцца да гарадской рускамоўнай ці па меншай меры да польскай. Ва ўсходніх раёнах Беларусі сярод ганаровых грамадзян колькасна пераважалі беларусы, а чым далей на захад павялічвалася і больш значнай сярод іх была ўдзельная вага рускіх. У Магілёўскай губерні беларусы сярод ганаровых грамадзян складалі 50,7%, рускія – 34,5%, у Віцебскай губерні гэтыя лічбы склалі адпаведна – 30,7 і 44%, Мінскай – 41,1 і 46,6%, Гродзенскай – 15,9 і 64,2%, Віленскай – 12,3 і 68,4%.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны ўдзельная вага ганаровых грамадзян у Віленскай губерні складала 0,3%, у Віцебскай – 0,2%, Гродзенскай – 0,1%, Магілёўскай – 0,2% [15, с. 321]. Удзельная вага іх у губернях еўрапейскай часткі Расійскай імперыі за перыяд з 1858 г. па 1910–1912 гг. павялічылася ў сярэднім з 0,05% да 0,7% [1, с. 222].

**Мабільнасць і стан пісьменнасці ганаровых грамадзян**

Ганаровыя грамадзяне разам з асобамі духоўнага звання, паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., прадэманстравалі найбольшую ступень тэрытарыяльнай мабільнасці сярод насельніцтва Беларусі. У прыватнасці, у Віцебскай губерні сярод ганаровых грамадзян налічвалася 43,9% мясцовых ураджэнцаў, 28,2% выхадцаў з іншых паветаў Віцебскай губерні, 27,3 % – ураджэнцаў іншых губерняў Расійскай імперыі і 0,6% – іншых дзяржаў [16, с. 98]. У Віленскай губерні ўдзельная вага мясцовых ураджэнцаў была больш нізкай у параўнанні з Віцебскай губерняй – 41,4%, ураджэнцаў іншых паветаў Віленскай губерні налічвалася 15,0%, іншых губерняў Расійскай імперыі – 42,7% і 0,9% – іншых дзяржаў [17, с. 96].

Атрыманне прыналежнасці да саслоўя ганаровых грамадзян стала адным з кірункаў узыходзячай сацыяльнай мабільнасці. Фарміраванне яго было спробай уключэння ў дадзеную сацыяльную групу асоб, якія мелі значныя асабістыя заслугі перад дзяржавай і грамадствам не толькі на дзяржаўнай службе, але і ў сферы прадпрымальніцтва, сельскай гаспадаркі, навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці. У той жа час прылічэнне да ганаровых грамадзян было абцяжарана шматузроўневай і складанай працэдурай. Напрыклад, гродзенскі гарадскі галава 23 снежня 1891 г. звярнуўся з просьбай да губернатара хадайнічаць аб наданні ганаровага грамадзянства гарадскому землямеру М. Любічу. Адпаведнае прадстаўленне гродзенскі губернатар 24 лютага 1892 г. накіраваў віленскаму генерал-губернатару. Далей хадайніцтва было накіравана міністру ўнут-

раных спраў [18, арк. 1–2]. Аднак міністэрства юстыцыі, у кампэтэнцыю якога ўваходзілі межавыя пытанні, нагадала, што М. Любіч не адпавядае патрабаванням аб наданні асабістага ганаровага грамадзянства [18, арк. 4–5].

Дастаткова аднароднымі лічбамі па беларускіх губернях вызначаўся стан пісьменнасці ганаровых грамадзян, купцоў, мяшчан. Адпаведна даных перапісу насельніцтва 1897 г., сярэднія паказчыкі іх вар'іраваліся ў межах ад 57,2% (Гродзенская губерня) да 47,8% (Мінская губерня) [19, с. 8]. Значна больш адрозніваліся даныя стану пісьменнасці жаночай часткі гарадскіх саслоўяў: іх колькасныя паказчыкі мелі больш значны дыяпазон варыятыўнасці ад 45,8% у Гродзенскай губерні да 34% – у Мінскай. Ганаровыя грамадзяне, таксама як і купцы, мяшчане, мелі больш высокі ўзровень пісьменнасці ў параўнанні з сярэднімі паказчыкамі ўсяго насельніцтва Беларусі, але ніжэйшы, чым дваране, чыноўнікі і хрысціянскае духавенства. Калі браць у сярэднім, то найбольш высокі паказчык адукаванасці быў адзначаны сярод насельніцтва Віленскай губерні – 33,9% (сярод жанчын – 25,2%). На другім месцы знаходзілася Гродзенская губерня – 33,1% (мела самы высокі паказчык сярод мужчын – 46,5%). Па астатніх губернях велічыня ўдзельнай вагі пісьменных жыхароў істотна не адрознівалася: Віцебская – 25,2%; Мінская – 23,8; Магілёўская – 23,3% [19, с. 8–11].

**Заключэнне**

Рост сацыяльнай актыўнасці насельніцтва, яго мабільнасці, актуалізацыя імкнення да сацыяльнага поспеху, адначасова жаданне засцерагчы вышэйшае саслоўе ад з'яўлення ў яго складзе шматлікіх выхадцаў з разначынных слаёў грамадства прымусілі ўрад Расійскай імперыі шукаць каналы для рэлізацыі магчымасцей узыходзячай сацыяльнай мабільнасці. Адным з іх стала стварэнне саслоўя ганаровых грамадзян. У значнай ступені атрыманне прыналежнасці да саслоўя ганаровых грамадзян было вынікам сацыяльнага поспеху на асабістым узроўні і паказчыкам кірунку урадавай палітыкі на групавым. Сацыяльны і нацыянальны склад ганаровых грамадзян цалкам адлюстроўваў кірунак урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі. Сегрэгацыя магчымасцей паступлення на дзяржаўную службу для асобных этна-канфесійных груп насельніцтва, рэгламентацыя сацыяльна-культурнай сферы вызначылі пераважна іншаэтнічны склад яго ў дачыненні да большасці насельніцтва. Беларусы складалі меншасць сярод ганаровых грамадзян, таксама як і сярод асабістых дваран, купцоў, мяшчан. Гэты фактар аказаў уплыў на працэсы станаўлення беларускай нацыі. Нешматлікасць уласнай эліты запаволіла нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне беларусаў у XIX – пачатку XX ст.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРТУРЫ

1. Иванова, Н. А. Сословно-классовая структура России в конце XIX – начале XX века / Н. А. Иванова, В. П. Желтова. – М. : Наука, 2004. – 574 с.

2.Свод законов Российской империи : полный текст всех 16 томов, согласованный с последними продолжениями, постановлениями, изданными в порядке ст. 87 Зак. Осн., и позднейшими узаконениями : в 5 кн. / под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского ; сост.: Н. П. Балкапов, С. С. Войт и В. Э. Герценборг. – Изд. неофиц. – СПб. : Рус. Кн. т-во «Деятель», 1912–1913. – Кн. 4, т. 9 : Свод законов о состояниях (1912). – 437 с.

3. Об установлении нового сословия под названием Почетных Граждан : манифест, 10 апр. 1832 г., № 5284 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. – СПб., 1833. – Т. 7 : 1832. – С. 193–195.

4. Коркунов, Н. М. Русское государственное право / Н. М. Коркунов. – СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1909. – Т. 1 : Введение и общая часть. – 623 с.

5. Правила об испрошении высочайших наград : имен. указ, 1 авг. 1898 г., № 15871 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3 : в 33 т. – СПб., 1901. – Т.18 : 1898, отд-ние 1. – С. 832–837.

6. О зачислении петербургского 2-ой гильдии купца Веремецко А. с сыном Павлом в потомственные почетные граждане // Нацыянальны дзяржаўны архіў Беларусі (НДАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2459.

7. Статистический временник Российской империи / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел. – СПб. : Тип. К. Вульфа, 1866. – Вып. 1.

8. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – Вып. 4 : Виленская губерния. Тетрадь 3 (последняя). – 179 с.

9. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899. – Вып. 5 : Витебская губерния. Тетрадь 1. – 51с.

10. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – Вып. 11 : Гродненская губерния. – 319 с.

11. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1904. – Вып. 22 : Минская губерния. – 243 с.

12. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – Вып. 23 : Могилевская губерния. – 275 с.

13. Общий свод по Империи результатов разработки данных первой всеобщей переписи населения, произведенной 28 января 1897 года : в 2 т. – СПб. : Паровая типолитогр. Н. Л. Ныркина, 1905.

14. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – Вып. 5 : Витебская губерния. Тетрадь 3. – 281 с.

15. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.

16. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1901. – Вып. 5 : Витебская губерния. Тетрадь 2. – 110 с.

17. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1901. – Вып. 4 : Виленская губерния. Тетрадь 2. – 104 с.

18. Дело по представлению гродненского губернатора о причислении землемера-таксатора Моисея Любича в почетное гражданство // Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі. – Ф. 378. Воп. 1892. Спр. 64.

19. Каханоўскі, А. Г. Узровень пісьменнасці жыхароў Беларусі на мяжы XIX–XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Весн. БДУ. Сер. 3. Гіст. Філас. Псіхал. Палітал. Сацыял. Экан. Права. – 2006. – № 1. – С. 7–11.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 18.02.2016

***Kahanovsky A.G.*** **The Distinguished Citizens as a Part of Social Structure of the Belarusian Society in the Second Half of XIX – Beginning of the XX Century**

*The article analyzes the reasons of the formation of the social estate of the distinguished citizens. The social base of the potential distinguished citizens, the possibilities of getting the new social status, the ways of the use of this channel for the rising of the social position are shown. The author characterizes the legal status, social and national composition of the estate of the distinguished citizens in Belarus, which first of all were defined by the main directions of the Russian Empire's policy on the Belarusian territory.*